Выстаўка

# Шкарпэткі для пустыні, кінжалы-каштоўнасці і тканіны адцення куркумы

## Звыш 100 прадметаў рамеснай спадчыны Амана прадстаўленыя ў Мінску

**Плецены з пальмавага лісця посуд для малака, традыцыйныя прыборы для гатавання і падачы кавы, нацыянальнае адзенне з розных рэгіёнаў, паясы з ножнамі і цырыманіяльная зброя, курыльніцы для ладану і распырсквальнікі ружавай вады, сярэбраныя ўпрыгажэнні як быццам наўпрост з Сярэднявечча і тканыя дываны з вярблюджай воўны, выробленыя рамеснікамі толькі сёлета, але з захаваннем старажытнай тэхналогіі... З 19 верасня да 19 студзеня 2020-га адна з выставачных залаў Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі — нібыта філіял усходняй казкі. Тут адкрылася і чакае наведвальнікаў экспазіцыя «Аман: жамчужына Усходу. Рамесная спадчына» з калекцыі Нацыянальнага музея Султаната Аман.**



Сябраваць культурамі нашы краіны пачалі не так даўно — толькі летась быў падпісаны мемарандум аб узаемаразуменні ў сферы спадчыны і культуры, а таксама пагадненне аб супрацоўніцтве паміж музеямі. Гісторыя і культура Беларусі былі прэзентаваныя ў Аманскім нацыянальным музеі ў Маскаце падчас адмысловай выстаўкі «Беларусь — на скрыжаванні цывілізацый», якая, дарэчы, стала першай замежнай выстаўкай з моманту яго адкрыцця ў 2016 годзе. Крок у адказ — экспазіцыя «Аман: жамчужына Усходу», што знаёміць беларусаў з узорамі матэрыяльнай і духоўнай культуры, традыцый Султаната Аман.



**Генеральны дырэктар Нацыянальнага музея Султаната Аман Джамал аль-Мусаві** раіць пачынаць агляд з кінжалаў Ханджар. Бо гэта больш чым зброя — нацыянальны сімвал, які прысутнічае нават на дзяржаўным гербе краіны. Вытворчасць кінжалаў Ханджар спалучае ў сабе работу са сталлю, дрэвам, тканінай, скурай, рогам і серабром; дзяржальна, лязо, ножны і паясы вырабляюцца паасобку і толькі потым збіраюцца ў адзіны ансамбль.





Нашы культуры бліжэйшыя, чым здаецца з першага погляду. Гэта разумееш, разглядаючы «пустынныя шкарпэткі» з казінай воўны, якія абараняюць ногі ад гарачага альбо невыносна халоднага пяску, скарпіёнаў, змей і шыпоў — і няўлоўна нагадваюць валёнкі. А вось прасторная аранжавая кашуля дзішдаша з Усходняга Аману, наадварот, пахне экзотыкай — у літаральным сэнсе. Бо фарбуюць нябеленую баваўну, скарыстоўваючы сумесь з куркумы, алею, гваздзікі, струкоў кардамону: пігмент дае аранжавы колер, а алей і спецыі абараняюць тканіну ад пылу і поту і надаюць устойлівы, рэзкаваты водар. Хусткі канга з уплеценымі залатымі і сярэбранымі ніткамі ўпрыгожаныя не толькі друкаванымі малюнкамі, але і надпісамі на суахілі, арабскай ці англійскай мове, праз якія можна даведацца пра рэлігійныя, сацыяльныя і нават палітычныя погляды яе ўладальніка — таму канга часам называюць «тканінай, якая гаворыць»... Словам, і з першага, і з другога, і з трэцяга погляду тут ёсць што разгадваць, таму куратар выстаўкі, малодшы навуковы супрацоўнік аддзела рускага і замежнага мастацтва Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі **Кацярына Даська** заўважае, што некалькі месяцаў экспанавання — зусім невялікі тэрмін: «Аманская культура мае шматвяковую гісторыю, але яна някідкая. Каб зразумець яе і пранікнуцца, варта наведаць выстаўку не адзін раз, уважліва ўглядацца ў дэталі ўпрыгажэнняў і адзення, штораз заўважаючы нешта новае».

Выстаўка ўмоўна падзеленая на некалькі блокаў, якія наглядна паказваюць месца вярблюдаў у жыцці аманцаў, гасціннасць і падачу ежы, ткацкае рамяство, ювелірныя вырабы і цырыманіяльную зброю, веравызнанне і культуру духмянасцяў. «У экспазіцыі прадстаўленыя больш за 100 прадметаў, — расказвае Джамал аль-Мусаві, — яе канцэпцыю мы распрацоўвалі разам з беларускімі калегамі, каб паказаць у Мінску культурную спадчыну, якая і сёння з'яўляецца часткай нашага ладу жыцця: гэта ўнікальныя аманскія кінжалы, у тым ліку два султанскія, прадметы, звязаныя з культурай водараў, упрыгажэнні, якімі славіцца Аман, прадметы мужчынскага, жаночага і дзіцячага адзення — яно яркае і вельмі разнастайнае, бо кожны раён мае свае традыцыі...»

Канешне, агульная калекцыя, якая захоўваецца за некалькі тысяч кіламетраў ад Мінска ў сталіцы Амана Маскаце, у шмат разоў багацейшая. У Нацыянальным музеі Султаната Аман на плошчы 24 тысячы квадратных метраў прадстаўленыя больш за 7 тысяч прадметаў, якія адлюстроўваюць у тым ліку нематэрыяльную спадчыну краіны: паэзію, казкі, гастраномію, традыцыйныя танцы і г. д. Музей, як не без гонару адзначае яго кіраўнік, абсталяваны найсучаснейшымі тэхналогіямі, мае асобны асветніцкі цэнтр, дзе вядзецца работа са школьнікамі і студэнтамі, а таксама ўласныя рэстаўрацыйныя лабараторыі і кіназалу для дэманстрацыі дакументальных фільмаў пра культурную спадчыну Амана. Акрамя таго, інфраструктура музея адпавядае патрабаванням інклюзіі — ён дасяжны для невідушчых і наведвальнікаў у інвалідных калясках.

На адкрыцці выстаўкі «Аман: жамчужына Усходу» **міністр культуры Беларусі Юрый Бондар** падкрэсліў, што гэты праект стане яшчэ адным важным этапам у супрацоўніцтве нашых краін. І насамрэч, экспазіцыя — толькі частка маштабнай праграмы, у якой прысутнічаюць падпісанне мемарандуму аб узаемаразуменні паміж архіўнымі ведамствамі нашых краін, перадача больш чым 500 кніг у падарунак Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, правядзенне культурна-асветніцкіх мерапрыемстваў для дзяцей і моладзі. У студзені наступнага года Нацыянальны музей Султаната Аман стане ганаровым госцем на святкаванні 80-годдзя нашага Нацыянальнага мастацкага музея, а крыху пазней у тым жа годзе запланавана правядзенне Дзён культуры Беларусі ў Амане.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**
**Больш здымкаў глядзіце на нашым сайце www.zviazda.by.**

На слыху

# КОЛЕР НАСТРОЮ — ПОПЕЛЬНЫ

## Пераможцай нацыянальнага адбору на дзіцячае «Еўрабачанне» стала 14-гадовая мінчанка

**Увечары 20 верасня адбыўся фінал нацыянальнага адбору дзіцячага конкурсу песні «Еўрабачанне-2019», што пройдзе сёлета ў польскім Глівіцы. Гледачы і прафесійнае журы выбіралі чарговага музычнага дэлегата з 10 удзельніц — так атрымалася, што сіта папярэдняга тура прайшлі толькі дзяўчаты-спявачкі і дзявочыя калектывы.**

Сёлета, дарэчы, арганізатары пастараліся выключыць накруткі ў глядацкім галасаванні, таму з кожнага тэлефоннага нумара прымаліся толькі адзін званок і СМС-паведамленне. Паралельна свае адзнакі юным артысткам выстаўляла прафесійнае журы, куды ўвайшлі прадстаўнікі Міністэрства культуры, Белтэлерадыёкампаніі, педагогі, кампазітары і выканаўцы.

Як часта бывае на «Еўрабачанні», фаварыты ў публікі і суддзяў аказаліся розныя. Так, у гледачоў найвялікшыя сімпатыі выклікала Марыя Ермакова з беларускамоўнай версіяй песні VETRA (1907 галасоў —12 балаў), а журы паставіла свае 12 балаў гурту Monkey Tops. Атрымалася парадаксальная рэч: тыя юныя артысты, якія ўжо маюць у творчым багажу значныя дасягненні, засталіся па-за межамі топ-3 найлепшых: ні сёлетняя пераможца дзіцячага конкурсу «Славянскі базар у Віцебску» Ксенія Галецкая, ні ўдзельніца шостага сезона расійскага шоу «Голас. Дзеці» магілёўчанка Арына Пехцерава, ні леташняя пераможца дзіцячага фэсту Сан-Рэма, чатырохразовая фіналістка нацыянальнага адбору Марыя Жыліна ў лідары не трапілі. Затое Елізавета Міснікава, што выступала пад нумарам 1, які рэдка прыносіць удачу, атрымала ад гледачоў і журы па 10 балаў, абышла ўсіх канкурэнтак — і заваявала права прадставіць нашу краіну на дзіцячым «Еўрабачанні-2019».

— Гэта было маёй марай! — эмацыянальна прызналася артыстка адразу пасля завяршэння гала-канцэрта. — Я тройчы ўдзельнічала ў нацыянальным адборы і не трапляла ў фінальную дзясятку, а сёння я ў дзясятцы і я нумар адзін! Прыз-сэрца пастаўлю ў студыі, каб усе яго бачылі, цяпер галоўнае — данесці яго цэлым са сцэны, гэта яшчэ нікому не ўдавалася, але я данясу! Хто мае самыя галоўныя балельшчыкі? Бацькі і вялікая каманда #teamПепельны, якім я вельмі ўдзячная за падтрымку. Цяпер трэба дагнаць аднакласнікаў у школе, бо я там даўно не была, і прыкласці ўсе намаганні для падрыхтоўкі да «Еўрабачання». Сёння я выклалася на 100 %, але ў Польшчы абяцаю выступіць яшчэ ў тысячу разоў лепей і пастараюся прынесці Беларусі перамогу.




Лізе Міснікавай 14 гадоў, яна вучаніца музычнай школы і сталічнай гімназіі № 56, а таксама падапечная Вольгі Драздовай, у вакальнай студыі StudioPlay якой займаліся і папярэднія ўдзельнікі дзіцячага «Еўрабачання» — Даніэль Ястрэмскі, Руслан Асланаў, Хелена Мерааі. Песня «Пепельный» беларускіх аўтараў Наталлі Тамбоўцавай і Кірыла Гуда, з якой дзяўчына выступіць у Польшчы, — пра тое, як лёгка ў сучасным свеце чалавек можа змяняцца (даслоўна: «Переназови — и серый станет silver», «Ты сегодня в серой майке, а завтра — пепельный, пепельный, яркий и пепельный»). Зрэшты, артыстка не выключае, што аранжыроўка і тэкст песні да міжнароднага конкурсу яшчэ будуць удасканальвацца, балазе да 24 лістапада час ёсць.

Нагадаем, для Беларусі гэта будзе ўжо 17-е выступленне на дзіцячым «Еўрабачанні». На гэты момант у «медальным заліку» конкурсу лідзіруе Грузія, у якой тры перамогі, па дзве — у Беларусі, Расіі і Мальты, таксама прадстаўнікі нашай краіны адзін раз займалі другое месца і двойчы — трэцяе.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота прэс-службы Белтэлерадыёкампаніі.**